ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЯ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА І МЕНСКАГА КОМІТЭТАЎ ЛЕНІНСКАГА КОМУНІСТЫЧНАГА САЮЗУ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

№ 77 (459) Аўторак 12 ліпеня 1927 г. | Выходзіць тры разы на тыдню у АЎТОРАК, ЧАЦЬВЕР І СУБОТУ | Год выд. VII. | Рэдактар прымае ад 12 да 2 гадз. дню. Сакратар ад 10—12 і ад 2—3 гадз. Тэл. № 903. | Адрас рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена“: Менск, Комсам. 25.

Вялікая цэгліна ў будынак соцыялізму.

10-га ліпеня—у дзень сьвяткаваньня сёмай гадавіны вызваленьня Беларусі ад белапалякаў, адбылося ўрачыстае адчыненьне работ на Асінастроі. У гэты дзень закладзен першы камень таго вялікага, магутнага прадпрыемства, „якое павінна павесьці за сабою экономічны ўздым у значнай частцы Савецкай Беларусі“. У гэты дзень закладзен будучы нэрв нашай краіны. У гэты дзень—дзень падліку вынікаў пройдзенага працоўнымі БССР. Параўнаўча кароткага шляху мірнай творчай соцыялістычнай працы рабочыя і сяляне пад кіраўніцтвам Комуністычнай Партыі зрабілі пачатак тэй вялікай справы, якая значна паскорыць наша будаўніцтва соцыялізму.

На Асінаўскім балоце, ад якога акаляючае насельніцтва ня мела ніякай карысьці, праз 2 з паловаю гады запрацуе магутная электростанцыя, якая выклікае рэволюцыю ва ўсёй народнай гаспадарцы БССР.

Станцыя, яе магутнасьць—2 турбагэнэратары па 11 тысяч кілёуатт у першую чаргу, 33 тысячы— у другую чаргу і давядзеньне яе ў далейшым да 70 тысяч кілёуатт—караным чынам зьменіць твар нашай краіны.

Асінастрой забясьпечыць дзяшовай электрычнай энэргіяй беларускую прамысловасьць. Ён дасьць магчымасьць пабудовы шэрагу новых фабрык і заводаў. Так, напрыклад, згодна пяцёхгадовага пляну разьвіцьця народнай гаспадаркі ў раёне трохкутніка Віцебск-Ворша-Шклоў, у працягу бліжэйшых гадоў вызначана пабудова вялікага цэглянага і маслабойнага заводу, льна-ткацкай і льна-прадзільнай фабрык, косткапрацоўчага заводу і іншых прадпрыемстваў; у Воршы будуць пабудованы—бэконны і валяковы заводы, льна-прадзільная фабрыка і г. д.

Электрычная энэргія Асінастрою дасьць магчымасьць перабудаваць, пашырыць і мэханізаваць: Копыскія ізразцовыя заводы, тэкстыльную фабрыку „Дзьвіна“, Дубровенскую мануфактуру, панчошна-трыкатажную фабрыку, папяровую (у Шклове) і г. д.

Новыя фабрыкі і заводы, сеткай якіх будзе пакрыты ўвесь раён, абслугоўваемы Асінастроем, пацягнуць за сабою ўзмацненьне ролі прамысловасьці ў агульнай сыстэме народнай гаспадаркі БССР.

„Асінастрой—гэта прадпрыемства, якое штурхне значныя масы сялянства па шляху **інтэнсыфікацыі** сваёй гаспадаркі, па шляху разьвіцьця **тэхнічных культур для прадпрыемстваў**, якія арганізуюцца вакол Асінастрою“ (Кнорын). Мэханізацыя сельскай гаспадаркі раёнаў, якія прылягаюць да Асінастрою, з дапамогаю электрычнай энэргіі пачне расьці шпаркім тэмпам.

Асінастрой, які падыме нашу прамысловасьць на болей высокую тэхнічную ступень, павядзе сельскую гаспадарку па шляху інтэнсыфікацыі --адыграе надта вялікую ролю ў справе разьвіцьця нацыянальнай культуры, якая, ведома, можа расьці, ісьці ўперад толькі дзякуючы росту і посьпехам тэхнікі, дзякуючы падвядзеньню высокай тэхнічнай базы пад наша гаспадарчае будаўніцтва.

Вось, што азначае сабою Асінастрой і што ён нясе для працоўных мас Беларусі.

10-е ліпеня на Выдрыцкім балоце яскрава малюе нам тую агромністую розьніцу між політыкай дзяржавы пролетарскай дыктатуры і політыкай капіталістычных дзяржаў. У той час як яны наступаюць на рабочую клясу, рыхтуюць новую вайну і г. д., наша краіна занята вялікім будаўніцтвам соцыялізму, вялікай цэглінай у будынак якога будзе зьяўляцца наш Асінастрой.

Саюзны ўрад, як ведома, адпусьціў на пабудову Асінастрою 9.320 тысяч рублёў (а ўсяго патрабуецца 13,500 тысяч руб.). Гэта яшчэ раз кажа аб тым, што толькі ўваходзячы у СССР, толькі з дапамогаю апошняга, можа, як і іншыя нац. рэспублікі, расьці і ўзмацняцца Савецкая Беларусь.

Зараз задача зводзіцца да таго, каб прыцягнуць увагу, арганізаваць дапамогу ў справе пабудовы Асінастрою з боку шырокіх працоўных мас. Комсамол і ў першую галаву Аршанская арганізацыя павінны ісьці ўперадзе па выкананьню гэтай задачы.

Беларускі Волхаўстрой.

„Камунізм—гэта ёсьць савецкая ўлада плюс электрыфікацыя ўсёй краіны“ (ЛЕНІН)

10 ліпеня адбылося ўрачыстае адчыненьне работ на Асінастроі.—На адчыненьне сьцяклося да 10 тысяч ваколічнага насельніцтва

Днём прыходзілі цягнікі... Ноччу таксама раздаваліся іх моцныя гудкі... З розных акруг Беларусі дастаўлялі яны на станцыю Ворша гасьцей, дэлегацыі, запрошаных на ўрачыстае адчыненьне работ па пабудове магутнай Асінастроеўскай электрычнай станцыі.

Начная сьвежая паветра купала ціхі пагружаны ў сон горад.

Здавалася, што як і заўсёды ноч пройдзе ціха і спакойна... Але, не...Дзесьці стала чутна песьня якая пяялася ідучым кудысьці колектывам.

У Воршы не засталося ніводнага комсамольца.

Яшчэ пачынала сьвітаць, як уся організацыя бурнай лавінай кацілася па дарозе да Выдрыцы,, лавінай,



Галоўны інжынэр Асінастрою тав. Алейнікаў.

хутка нарастаючай комсамольцамі з падарожных вёсак.

Рыхтаваліся ў гэтую ноч і дубровенцы. І калі ў 4 гадзіны раніцы цяжка запеў гудок дубровенскай фабрыкі, ніхто ўжо ня спаў... Сабраліся на фабрычным двары і адтуль з оркэстрам пакіраваліся да месца будучай вялікай станцыі.

Ішлі ня толькі з Воршы і Дуброўны. З усёй шырокай адлегласьці **Аршанскага, Дубровенскага, Багушэўскага, Горацкага, Коханаўскага раёнаў** ручайкамі цяклі групкі людзей да Выдрыцы.

Шмат прышло на станцыю Ворша, каб адтуль **цягніком паехаць у Выдрыцы...**

Але!.. Цягнікам у Выдрыцы!

Таму ў апошнія тыдні энэргічна кіпела работа па пракладцы веткі з Воршы да Выдрыцы, каб да дню адчыненьня работ павесьці гасьцей па чыгунцы.

Ў адным купэ разьмясьцілося ўсе бюро Аршанскага Акругкому комсамолу.

Ціха ідзе цягнік па няпрывычнаму яшчэ, да такой надта вялікай цяжкасьці, шляху

Гучна зьвіняць рэйкі... Хрусьцяць... Раптам, гукі гэтага звону патанулі ў вялікіх крыках «ура»... «ура».

Вакол шляху ўся вёска Ступакі на чале з Ступакоўскай комсамольскай ячэйкай. Яшчэ толькі пачынала сьвітаць, як комсамольцы ўжо беглі па вёсцы будзіць сялян. Прышлі са сьцягам. Барадатыя старыкі... малыя дзеці... усе прышлі на адчыненьне. Астанавілі цягнік. Сакратар комсамольскай ячэйкі тав. Холер вітаў прадстаўнікоў ураду ад імя сялян вёскі Ступакі. Адказваў тав. Галадзед.

Хутка разьмясьцілі ў вагоне ступакоўцаў і цягнік зноў папоўз па зьвінячым рэйкам.

Удалі пачалі вырысоўвацца абрысы старога выдрыцкага хэмічнага заводу, дзе будзе абсталявана часовая электрычная станцыя. Ужо бялеюць новыя дамы рабочых.

Плошча Выдрыцы мае сьвятошны выгляд. У ёй кіпіць, як у бурлячым катле.

Прышлі ўсе чырвонаармейскія часьці аршанскага гарнізону.

Усяго на адчыненьні прысутнічае каля 10 тысяч чалавек.

Цёплы вецерок калыша сьцягі і веткі елачак, якімі прыбрапа трыбуна.

Сьпевы, сьмех, плач оркестру--усё гэта напоўніла ціхую Выдрыцу хорам роз настайных гукаў.

Часам забываеш, што знаходзішся ў абкружанай лесам, полем і балотамі, Выдрыцы. Часам пачынае здавацца, што гэты шум выходзіць з шумнага, шматлюднага, прыгожага гораду Асінастрою.

Улегся шум тады, калі на трыбуне паявіліся **т.т. Кнорын, Галадзед, Карп, Калнін, Амбражунас** і інш. Тут-жа, прыехаўшыя з Масквы сакратар Савету Труда і Абароны тав. **Кактынь** і прадстаўнік ад Украінскага ўраду ў Маскве тав. **Пятроўскі.**

Мітынг

Урачысты сход адчыняе старшыня ВСНГБ БССР тав. **Карп.**

— Таварышы рабочыя, сяляне і чырвонаармейцы! Сёньня у дзень вялікага сьвята працоўных Беларусі, ў дзень вызваленьня ад белапалякаў, мы кладзем пачатак работам па пабудове вялікай электрычнай станцыі, першай раённай станцыі на Беларусі, якая дасьць электрычны ток нашым фабрыкам і заводам. Асінастрой паскорыць тэмп разьвіцьця нашай гаспадаркі, Асінастрой палепшыць добрабыт працоўных БССР.

Ад імя ўраду БССР тав. **Карп** абвяшчае ўрачысты сход, прысьвечаны адчыненьню работ на Асінастроі, адчыненым.

Тав. **Галадзед** падняў, у адзнаку адчыненьня работ, сьцяг над трыбунай.

— Толькі што,—кажа т. **Галадзед**, —мы паднялі чырвоны сьцяг над баламі, якія раней ня прыносілі карысьці ні дзяржаве, ні працоўным.

Наш урад падышоў шчыльна ня толькі да задачы асушкі балот, але і да іх скарыстаньня, для здабываньня ад іх карысьці. У сёньняшні дзень, калі ўсе працоўныя БССР сьвяткуюць гістарычны дзень вызваленьня Беларусі ад польскай окупацыі, мы падводзім вынікі сваёй працы на фронце адбудаваньня сваёй, разбуранай у пэрыод вайны, гаспадаркі. Наша прамысловасьць складае 3 з пал. процанты ў адносінах да сельскай гаспадаркі. Наша задача—узмацніць прамысловасьць БССР.

Адбудоўчы пэрыод ужо скончан. Мы цяпер приступаем да рэорганізацыі, рэ-



Будынак, у якім будзе пабудавана часовая электрычная станцыя ў Выдрыцы.

конструкцыі нашай прамысловасьці. Асінастрой дасьць электычны ток Аршанскай, Магілеўскай і Віцебскай акругам. Ён будзе рухаць уперад гаспадарку гэтых акруг і будзе вызначаць размах і вагу вытворчасьці ў агульнай экономіцы БССР. Вакол Асінастрою будуць нарастаць такія прадпрыемствы, якія індустрыялізуюць сельскую гаспадарку, падымуць яе на вышэйшую ступень. Нашы дасягненьні залежаць ад двух фактараў: 1) ад творчага энтузыязму працоўных, 2) ад нашай братэрскай сувязі з народамі СССР. Мы--частка Савецкага Саюзу. Мы будуем Асінастрой ня толькі на свае сродкі, а і на сродкі СССР. Ўрад СССР нясе асноўную долю выдаткаў па пабудове станцыі. З агульнага бюджэту Асінастрою ў ліку 13 з пал. мільёнаў рублёў, 9,320 тысяч складаюць сродкі ўраду СССР.

На спробы нашых ворагаў перашкаджаць нам, мы адкажам яшчэ большым узмацненьнем будаўніцтва соцыялістычнай гаспадаркі. Тыя, хто нам пажадае пашкодзіць, разаб'юць сваю галаву аб магутны кулак рабочых і сялян.

З прамовы тав. Кнорына

Савецкая Беларусь сьвяткуе сёньня двайное сьвята. 7 год таму назад арганізаванымі патугамі рабочых, сялян, паўстанчаскіх атрадаў і Чырвонай арміі, мы выгналі з Беларусі паноў, банкіраў і апошнія окупацыйныя польскія войскі. У 1920 годзе, 11-га ліпеня чырвоны сьцяг узьвіўся над абшарамі Беларусі.



Сакратар яч. ЛКСМБ Асінастрою тав. Ніхамкін.

Сёньня мы пачынаем скарыстоўваць балоты, каб рухаць уперад нашу гаспадарку. Мы прыкладзем усе патугі, каб гэтае будаўніцтва з посьпехам закончыць. Я заклікаю ўсіх працоўных усямернаму садзейнічаньню гэтаму шырокаму мерапрыемству Савецкага ўраду. Я перадаю лепшыя пажаданьні тым рабочым, тым інжынэрам, на якіх ускладаецца адказнасьць па выкананьню гэтай складанай задачы.

Выступіўшы з адказам галоўны інжынэр тав. **Алейнікаў** заверыў усіх прысутных, што працоўнікі Асінастрою зробяць усё залежачае ад іх, каб к канцу 1929 году ток пашоў па свайму вызначэньню.

Ад 9-тысячнай арміі комсамольцаў Аршаншчыны, выступіў адказны сакратар Аршанскага Акругкому ЛКСМБ тав. **Варончанка.**

Выступалі яшчэ т. т. **Хацкевіч, Кактынь, Пятроўскі, Турлай** (ЦСПСБ), селянін Аршанскага раёну—тав. **Шынькевіч**, чырвонаармеец—**Шынбэрг**, ад рабочых мэталістаў Віцебску—**Альхамовіч, Бірыла** (АК КПБ), работніца Віцебскай фабрыкі «Дзьвіна»—**Пятроўская**, прафэсар Беларускай Сельска-Гаспадарчай Акадэміі—**Іваноўскі**, Амбражунас (АВК) і шмат іншых таварышоў.

* * *

Мітынг скончан.

У руках тав. Алейнікава куча прывітальных тэлеграм.

Пасланы прывітальныя тэлеграмы ЦК УсеКП(б), ЦК КП(б)Б, ЦВК і Саўнаркому СССР і БССР, Дзяржпляну, Савету Працы і Абароны.

З-за плячэй цяжка навісшых хмараў, глянула сонейка.

Хутка разьмясьціліся па вагонах.

Коцім назад у Воршу.

Весела ў вагонах. Гутаркі вядуцца толькі аб Асінастрою.

— Вось,—расказвае адзін комсамолец,—сёньня раніцай ішоў я зьбіраць сялян, спаткаў двух старычкоў з катомачкамі па плячох.

— Куды—пытаю—ідзеце?

— Шукаем,--кажуць яны,—месца, дзе павінна адбыцца адчыненьне электрычнай станцыі. Там будуць прадстаўнікі нашага ўраду.

— Ці ведаеце,—пахваліўся сакратар Дубровенскага Райкому,—мая організацыя зьявілася на адчыненьне амаль што ўся.

У такіх гутарках, няпрыкметна для нас, падкацілі да Воршы.

Ноччу ўходзілі цягнікі... Днём таксама раздаваліся іх моцныя гудкі.

Ва ўсе бакі развазілі яны прысутнічаўшых на адчыненьні Асінастроеўскіх работ.

Р. Г—н.



Па зарубежжу

Антысавецкая паўціна ў Нямеччыне

Калі на апошняй сэсіі Лігі Нацый Чэмбэрлен узмацнёна працаваў над стварэньнем антысавецкага блёку вялікіх і малых дзяржаў, яму ў асноўным прыходзілася вырашаць пытаньне аб Нямеччыне—якім чынам перацягнуць яе ў лягер адкрытых ворагаў СССР.

Антысавецкая Нямеччына патрэбна Чэмбэрлену як для ажыцьцяўленьня экономічнай блёкады СССР, так і на выпадак польска-савецкай вайны.

Што-ж датычыць магчымасьцяў польска-савецкай вайны, дык тут Чэмбэрлену прыходзіцца ствараць у Польшчы ўпэўненасьць, што Нямеччына ў гэтую вайну не ўмяшаецца і ня выступіць супроць Польшчы. Інакш Польшча заўсёды будзе з трывогай азірацца на сваю нямецкую граніцу. Што-ж зроблена Чэмбэрленам у гэтым напрамку на сэсіі Лігі Нацый?

З запытаньня комуністычнай фракцыі нямецкага парляманту мы даведваемся, што ў Жэнэве было вырашана: склікаць новую тайную конфэрэнцыю дзяржаў, якія прымалі ўдзел у падпісаньні лёкарнскага дагавору. У гэтай конфэрэнцыі павінна прыняць удзел і Польшча.

Як ведома, § 16 статуту Лігі Нацый патрабуе ад яе членаў пропуску карапцельных экспэдыцый Лігі супроць дзяржаў, якія не падначальваюцца яе рашэньням. Калі Нямеччына ўступала ў Лігу Нацый, яна заявіла, што на яе § 16 распаўсюджвацца ня можа, паколькі яе армія вельмі малалікая. Прасьцей кажучы, гэта азначала, што, у выпадку спробы ўзброенага нападу Лігі Нацый на СССР, Нямеччына праз сваю тэрыторыю не прапусьціць варожых Савецкаму Саюзу армій.

Будучая тайная конфэрэнцыя павінна будзе дабіцца ад Нямеччыны поўнага яе падначаленьня § 16 статуту Лігі Нацый. Тады Польшча ўжо зможа спакойна ваяваць з СССР.

За падначаленьне гэтаму параграфу Нямеччына атрымае дазвол на павялічэньне арміі у 4 разы. Акрамя гэтага, узбраеньне нямецкай арміі будзе ўзмацнёна цяжкай артылерыяй, танкамі і г. д.

Нямеччына, пашоўшы на гэту вудачку Чэмбэрлена, можа прайграць экономічна і, у дадатак, аказацца ўцягнутай у вайну, ад якой яна асаблівых выгад чакаць ня можа.



„Свабодныя“ выбары

У Румыніі пачаліся выбары ў парлямэнт. Выбары праходзяць пад адзнакай мацнейшага тэрору. Кіраўніцтва выбарамі палкам у руках жандармэрыі. (З газэт).



Галасаваньне простым паднятым рук...

Мы ня ўмеем добра адпачываць

Як працуе і адпачывае тав. Сямашка.

Што значыць—„фізкультура—24 гадзіны ў суткі.

Як я працую і адпачываю

Пачынаю я работу каля 9 гадзін раніцы. Прапрацоўваю дома, што трэба рабіць у гэты дзень у камісарыяце альбо пішу тэрміновыя артыкулы. У пачатку 11-й — звычайна пачынаю работу ў камісарыяце. Калі 2-х гадзін сьнедаю. Гэта аднімае ў мяне каля 5-7 хвілін. Але я нязьменна адзначаю, што ў той дзень, калі не ўдаецца пасьнедаць (бываеш на якіх небудзь пасяджэньнях,—зморваешся куды хутчэй і работа ідзе горш.

У 4 з пал.—5 гадзін я звычайна еду дамоў абедаць. Пасьля абеду 15-20 хвілін абавязкова адпачываю. Калі ў гэтыя гадзіны бываюць пасяджэньні альбо выступленьні, я ўсё-ж такі хаця 10 хвілін, але адпачываю, „абмываю мазгі".

Гэты адпачынак займае мала часу, але мае выключна важнае значэньне. Прыяжджаеш дамоў зморany, а пасьля адпачынку едзеш такі бадзеры, быццам-бы толькі пачынаеш працоўны дзень. І калі я бачу, што ў 12 гадзін альбо а першай гадзіне ўночы таварышы клююць носам ад зморанасьці, я сяжу зусім са сьвежай галавой,—я гэтую розьніцу прыпісваю выключна пасьляабедзенаму адпачынку.

Увечары звычайна бываюць пасяджэньні альбо выступленьні.

Гадзіны вячэрняга адпачынку, асабліва, калі зварочваешся зморaным з якога небудзь вялікага дакладу, я люблю праводзіць у тэатры і больш усяго ў опэры. Я лічу, што музыка і пеньне зьяўляюцца лепшай формай адпачынку.

Па нядзелям я настойчіва стараюся абавязкова падыхаць чыстай паветрай і „разьмяцца". Праўда, гэта не заўсёды ўдаецца—і калі-ні-калі адрываюць тэрміновыя справы, але я імкнуся да гэтага з вялікай настойлівасьцю і звычайна дабіваюся.

Улетку я люблю „прамяцца" на вэлёсыпэду. Узімку надта люблю бегаць на лыжах. У нядзелю ў адзіноцтве я выконваю свае літаратурныя „нядоімкі".

Так у агульным я працую і адпачываю. Магу сказаць толькі адно: мне зараз 52 гады, але ў рабоце і ў здароўі, ды, мабыць, і ў сіле выносьлівасьці ў фізычных практыкаваньнях я, па цікаваму выразу тав. Разанава, пацягаюся з двума 26-цігадовымі маладцамі.

Я прыпісваю гэта выключна таму рэжыму, хоць надта далёкаму ад дасканальнасьці, які я ўстанавіў. К слову сказаць, я ня куру, ды к алкаголю ня маю ніякай ахвоты.

Н. А. Сямашка.

Адна за другой.

(Дуброўна).

За досыць кароткі тэрмін мы ўжо налічваем дзесяткі экскурсій моладзі ў Дуброўна.

Комсамольцы наведваюць фабрыку «Дняпроўская мануфактура», вядуць там гутаркі з рабочымі, знаёмяцца з вытворчасьцю.

Цікавяцца яны і сельскай-гаспадаркай--ідуць у племгаспадарку «Станіславага».

Дзеля прыёму экскурсантаў пры РК КСМ існуе камісія, якая і вядзе ўсю гэтую работу.

Экскурсанты цэлы дзень аглядваюць прадпрыемствы і г. д., а вечарам ідуць у кіно.



З Дуброўны —шлях на Асінастрой, а з Асінастрою—на завод «Чырвоны Кастрычнік. І туды цягнецца вераніца нашых экскурсантаў.

Ёсьць у экскурсіях і дрэнны бок: напрыклад, дырэкцыя фабрыкі Дняпроўская Мануфактура зусім не зацікаўлена ў тым, каб дапамагчы прыходзячым на фабрыку экскурсантам.

Гэткія зьявішчы трэба зьнішчыць.

Астап Лішанкоў.

Галоўнае—закаліць організм

Зараз многа маладых хлапцоў і дзяўчат пашлі і ўходзяць у летні водпуск. Ня ўсе яны могуць быць у доме адпачынку.

Каб разумна і мэтазгодна скарыстаць свой летні водпуск, неабходна прытрымлівацца разумнай праграмы дню.

Першая ўмова—трэба старацца заўсёды дыхаць чыстай паветрай. Бываць пабольш на паветры, у пакою адчыняць вокны і днем і ноччу. Многае залежыць таксама ад кармленьня. К 9 гадзінам раніцы—сьнеданьне, пасьля чаго ўвесь час да абеду трэба праводзіць у парку або ў садзе. У працягу часу ад 10 гадзін раніцы да 4 гадзін дню трэба скарыстаць сонца і ваду.

К 4—5 гадзінам—абед. Пабольш-гародніны, супу, баршчу, варэных фруктаў, кашы, умераная колькасьць жыроў. Пасьля абеду карысна адпачыць гадзіны паўтары.

К 8—9 гадзінам вечары—вячэра (гарбата, салат з гародніны, яйкі). Класьціся спаць трэба не пазьней 11 гадзін, прычым старацца да сну гадзіны 2—3 ня есьці. Сон павінен працягвацца ня больш 8 гадзін. Уставаць штодзённа трэба а 7 гадзіне раніцы і класьціся ў 11 гадзін.

Ваду, як узмацняючы сродак ужываць можна ў выглядзе абціраньняў, абліваньняў, ван, душаў і купаньня. Спачатку неабходна прывучыць нашу скуру да карыснай дзейнасьці вады (лепш за ўсё шляхам абціраньня).

Абціраньне робіцца мокрым ручнікам зараз-жа пасьля ўставаньня раніцай з ложку (па $^1/_2$—1 хвіліне—пакуль скура не пачырванее) і затым трэба выцерціся да суха. Пасьля таго, як скура зробіцца прывычнай да абціраньня, пераходзіць к абліваньню. Для душа можна скарыстаць чыстае вядро зрабіўшы на дне яго ў два кругі дзірачакі невялічкім цьвікам.

«Фізкультура 24 гадзіны»--лёзунг высунуты Наркамздравам Сямашкай ажыцьцяўляецца ня толькі гімнастыкай, практыкаваньнямі, але, галоўным чынам, закальваньнем організму і рэгулярнымі ўмовамі жыцьця.

Д-р Л. Чацкі.

Ох, як сумна, братцы!

(Па садох Менску)

Кожны з нас ведае, як у Менску і іншых гарадох організоўваюцца сады.

— Знойдзе загадчык клюбу невялічкі садзік, разьвядзе ў ім клумбы, кветкі, зробіць невялічкі катушок—сцэну, невялікую будку для кіноапарату, на заўтра „ўрачыстае адчыненьне" і... ўсё.

І сад пачынае працаваць. Як ён працуе, зараз убачым:

— **Сад Рабземлес** учыняе толькі сходы розных гурткоў, камісій і г. д. і толькі адзін раз у тыдзень практыкуе, як падарунак, кіно ці платны спэктакль. **Ніякіх гульняў, як напрыклад, кракет, гарадкі—там няма.** Ёсьць толькі невялічкія (2 мэтры ў даўжыню і шырыню) алеі, па якіх і „таўчэцца" публіка.

Сад „КІМ"у адразу стаў на гаспадарчую нагу. Кожны дзень у садзе кіно, спэктаклі заўсёды трэба плаціць грошы. Білеты прадаюцца ўсім; і ясна, што **50 проц. наведваючых—не комсамольцы.**

Сад шклянога заводу „Пролетары". Кожны дзень у ім скокі, скокі і скокі без канца. З боку оркэстр—„духавая гармонь" і скачуць ад 6-ці гадзін да позьняй ночы.

Віна тут падае таксама і на ячэйку ЛКСМ, якая нічога не зрабіла, каб даць моладзі цікавы спэктакль ці кіно і г. д.

Нядаўна адчыніўся **сад працаўнікоў сувязі.** Але разам з гэтым--адчыніліся і бойкі. Сад знаходзіцца на вельмі неспакойнай вуліцы (Нова-Маскоўская) і жыхары яе на адчыненьні зрабілі такую бойку, што моладзь баіцца заходзіць у гэты сад.

Сад друкароў. Самы неабсталяваны ў сэнсе прыгоднасьці для адпачынку моладзі. **Кожны дзень у ім кіно і кожны дзень беспарадкі.** Праз паркан лезуць «зайцы». «Кантралеры» за імі ганяюцца. Шум, скандал--адным словам «адпачынак»

Зараз аб **садзе мэталістаў.** Гэта адзін з садоў, які змог добра організаваць адпачынак моладзі, наладзіць у ім цэлы шэраг масавых мерапрыемстваў: організаваў шахматныя спаборніцтвы, якія прыцягнулі шмат моладзі і наогул паставіў сваёй мэтай выкарыстаць карысна вольны час моладзі ў гэтым садзе.

Іншыя сады не змаглі гэтага зрабіць. Энэргія моладзі там ня выкарыстана. А яна чакае свайго выкарыстоўваньня.

Г-к.



Пад адкрытым небам

(Языльская ячэйка, Стара-Дароскага раёну)

Улетку наша ячэйка пры клюбе зрабіла пляцоўку. Як толькі падыходзіць вечар, зьбіраецца тут каля 200 маладых хлапцоў і дзяўчат. Да гэтага-ж часу хоць і быў клюб у вёсцы Языль, але моладзь ня ішла туды, а організавала п'яныя вячоркі. І ня дзіва: у клюбе была вялікая сумота.

Цяпер на пляцоўцы працуюць гурткі: вайсковы і фізкультуры. Праводзяцца розныя гульні, сьпевы, грае гармонік. Уся культмасавая работа ячэйкі праводзіцца на гэтай пляцоўцы. Пад адкрытым небам, весела і карысна праводзіць наша моладзь свой вольны час.

Пучэня.

Ляхаўка ў палацах графа Чапскага.

3-га ліпеня 125 піонэраў-дзяцей ляхаўскіх рабочых пашлі ў лягеры. Гады, калі хлапцы проста выходзілі ў лес, у халодныя, дзіравыя палаткі, праводзячы ночы сярод трывог і хваляваньняў, прашлі. Мінулыя лягеры не давалі аніякага адпачынку піонэру.

Цяперашнія лягеры зусім інакшыя.

Мэта ясна і правільна—лягер другі дом адпачынку, дзе піонэр зараз разам з аздараўленьнем набывае і працоўныя навыкі.

Ляхаўскае райбюро піонэраў доўга думала дзе выбраць належнае, добрае месца для лягеру.

Можа кіно-фільм «Лясная Быль», а можа хто другі даў гэткую думку. Месца для лягеру выбралі саўхоз Прылукі, мінулую рэзыдэнцыю графа Чапскага.

Ляхаўка правяла вялікую падрыхтоўку. Групавыя сходы бацькоў прашлі з нябывалай актыўнасьцю.

Ляхаўскія рабочыя, прышоўшыя з трох скураных заводаў, з «Энэргіі і інш., з пахам скуры, копаці і гары доўга ня верылі. Як гэта іх дзеці будуць спаць, гуляць і бегаць у высокіх, сьветлых пакоях, дзе некалі жыў толькі граф?

—Быццам не!

Успацеўшыя піонэр-работнікі, урач, усё-ж даказалі і карысьць лягераў і сапраўдную магчымасьць жыцьця ў замку графа Чапскага.

— Ну, так, згодны! Няхай едуць.

Палова важнейшай працы была зроблена—заручыліся згодай і падмогай бацькоў.

Але гэта толькі быў пачатак.

Яшчэ прадстаяў самы галоўны бой з профсаюзамі, трэба было атрымаць грошы. І ўсё-жа з дзесяці профсаюзаў — было атрымана звыш 1000 рублёў.

Спэцыяльная камісія—зьвяно некалькі раз было ўжо ў Прылуках.

Апошняя падрыхтоўка зроблена, заключаны дагавор з заг. гаспадаркай па дастаўленьню малочных продуктаў і г. д.

Лягерны дзень строга разьмяркован, кожная гадзіна належна скарыстоўваецца. У 7 гадзін пад'ём, мыцьцё, спорт; у 8 з пал. сьнеданьне, праца, потым купаньне, абед, традыцыйная мёртвая гадзіна і г. д

Лягер пабудован так, каб быў і адпачынак і карысьць. Выяжджае ўрач, які ўвесь час будзе там. Спэцыяльна запрашаецца агроном, які папутна з практыкай у полі будзе даваць і тэорэтычныя веды.

Інструктар фізвыхаваньня ня толькі просты настаўнік фізкультуры, але яшчэ і настаўнік тапографіі—(асобнай вайсковай навукі), які ўвесь час лягеру будзе аб ёй апавядаць у даступнай хлопцам форме.

Алесь.

У тыдзень абароны

Праверым нашу баяздольнасьць!

У ПАХОД САБІРАЙСЯ!

Пасьля двухмесячнай падрыхтоўкі да манэўраў, комсамольцы Бабруйску чырвонымі байцамі вышлі ў паход. Манэўры працягваліся тры дні.

Што, трывога?

Комсамольцы гор. Бабруйску два месяцы рыхтаваліся да гульні-манэўраў, два месяцы вывучалі строй, вінтоўку, тактыку, устаў чырвонаармейца... А калі час манэўраў—ніхто ня ведаў. На апошнім тыдні прад днём вызваленьня Беларусі ад белапалякаў, большасьць комсамольцаў гораду пачала дагадвацца і вылічаць: манэўры павінны быць 9-10 ліпеня, значыць трывога на пару дзён раней. І многія самі сябе пераканалі, што трывога абавязкова будзе ў чацьвер, 7 ліпеня—якраз у той самы дзень, у які яна і павінна была адбыцца згодна пляну ходу манэўраў-гульні.

Камісія акружкому па правядзеньню манэўраў **падлічыла гэтыя дагадкі і перанесла трывогу на дзень раней: з 7—на 6-ае ліпеня.**

... Дзьве гадзіны ночы. Горад прыціх, прыплюснутыя да зямлі, тускла асьветленыя электрычнымі ліхтарамі і туманам ад месяцу, аднапавярховыя камяніцы як і раней—драмалі. Толькі час ад часу чулася на Соцыялістычнай вуліцы старанпае чоканьне абцасаў па шурпатым тротуары: гэта днявальныя комсамольцы, дзяжурныя і сябры камісіі па правядзеньню манэўраў выконвалі свае абавязкі.

Дзясятак комсамольцаў, што, баючыся, **каб не праспаць трывогу, сядзелі каля акружкому,** глядзелі на гэту начную сумятню чамусьці звычайна, бяз ніякіх дагадак.

І раптам загаласіла электрастанцыя: на збор, на збор, на збор...

Пяць трывожных гудкоў гарэзьліва, з хуткасьцю маланкі пранесьліся над горадам. Патух сьвет. Завадзкія і паравозныя гудкі падхапілі першыя трывожныя гудкі, электрастанцыі.

Камяніцы раптам ачнуліся і пачалі харкаць на вуліцы соннымі, на сьпех адзетымі людзьмі.

Гарадзкія абывацелі ўсунуўшыся ў расчыняныя вокны з непакоем і перапалохам глядзелі, як **комсамольцы кулямі імчаліся па вуліцах, абганялі адзін другога, канчалі на бягу апранацца.**

Гэта быў найцікаўшы малюнак!

А каля акружкому ўжо выстраілася чарга чалавек у 500 за атрыманьнем адзнакі аб сваячасовай яўцы на трывогу. Кожнаму хочацца атрымаць чырвоны квіток і з меншым нумарам. Кожны тышчыцца ўпярод, але і пярэднія моцна вартуюць сваю чаргу...

Праз паўгадзіны гарадзкія ячэйкі строем шагалі па вуліцах, сярод якіх **будаўнікі і мэталісты** вылучаліся сваёй стройнай паходкай—зусім як павайсковаму.

З бальконў партыйнага клюбу старшыня манэўравай камісіі т. Ізакаў зачытаў загад аб комсамольскім зборы, некалькі выступленьняў аб бягучым міжнародным моманце і ячэйкі адпушчаны на 61 гадзіну для канчатковага збору ў паход, гэта значыць да 5-ці гадзін дню 9-га ліпеня.

Трывога была вялікая і па ўсяму гораду, а ўсё-ж проц. 25 комсамольцаў праспала яе.

На другі дзень у вёснах

Першыя баявыя трывогі ў вясковых ячэйках адбыліся на другі дзень, ноччу 7-га ліпеня...

Комсамольцаў і комсамолак шклянога заводу «Комінтэрн» трывожны заводскі гудок застаў у час збору да паходу, у часе, калі дзяўчаткі пасьля дзённай працы на заводзе канчалі шыць паходныя мяшкі, укладваць у іх неабходныя рэчы.

Комсамольцы цялушанскай ячэйкі, як пачаў глыбокай ноччу званіць царкоўны звон—мігам зьявіліся ў вызначанае месца і пастроіліся ў шарэнгі.

У Гарбацэвічах склікалі на збор гукі трубы пастуховай, сыгналы агня.

Былі і сьмешныя моманты.

— Сакратар Брожынскай ячэйкі расказаў аб часе трывогі папу,—поп—пападзьдзі, пападзя—пападзянкам і так па ўсёй вёсцы.

У другой ячэйцы сакратар загадаў усім комсамольцам:—**хлопцы, калі сёньня будзе трывога--дык абавязкова зьбярыцеся.**

Панюхаем пораху, будзем салдатамі.

К 5-ці гадзінам у суботу вярстах у трох ад гораду па шасе пачалі зьбірацца вясковыя ячэйкі і адтуль ужо разам цэлымі ротамі, з сьцягамі і крычачымі плякатамі: **мы вайны ня хочам, але будзем да яе падрыхтаванымі, комсамолец--стойкі салдат рэволюцыі; на зборы праверым сваю моц і дысцыпліну і г. д.**—пашлі ў горад на вызначаныя месцы збору.

Комінтэрнаўская яч. ішла з сваім аркестрам, а таму далучыўшыяся да яе Каменская, Гарбацэвіцкая і др. яч. **утварылі цэлую стройную калёну і цэрэмоніяльным маршам увашлі ў горад...**

На комсамольскай фізкультурнай пляцоўцы фарміруецца полк. Прыбыўшы ваенны комсастаў правярае па сьпісах роты, узводы. Чутны загады: **Сьмірна! Стаяць вольна!** З месца ня выходзіць! Можна пакурыць!

У піонэрскім садзе фарміруецца асобны батальён.

Гадзін у 10 вечару полк і асобны батальён былі ў поўнай баявой гатоўнасьці.

Быў загад «вольна!»

Гармонікі і бубны пашлі ў ход. Паставіўшы вінтоўкі ў козлы, адны гуляюць лявоніху, другія сьпяваюць «Наш паровоз», «Ой паслала мяне маці».

Лепш за ўсіх сьпяваюць **Гарбацэвіцкія хлопцы.** Каля іх зьбіраюцца і комсамольцы з другіх ячэек.

І на фізкультурным пляцку былі песьні, музыка, была вясёлая радасьць і бадзёрасьць.

Многія комсамольцы прашлі вёрст па 40. Але яны не змарыліся. Яны сёньня—комсамольцы-чырвонаармейцы, байцы рэволюцыі. **А байцы рэволюцыі прыставаць ня маюць права.**

— Сьмірна!

Камандзір комсамольскага збору, комдзіў 4-ай стралковай імя нямецкага пролетарыяту дывізіі, сумесна з сакратаром ЦК ЛКСМБ т. Галавачом, з сакратаром АК ЛКСМБ т. Хількевічам, Сьцяпанавым, Ізакавым—робіць абход збору. Пасьля абходу—некалькі слоў:

— Сёньня, заўтра і яшчэ адзін дзень--вы чырвоныя байцы. Ад вас патрабуем мы зараз бясспрэчнага выконваньня ўсіх загадаў вашых камандзіраў, дысцыплінаванасьці, вытрыманасьці.

Вайсковая гульня комсамольцаў.



Псковскі губэрскі камітэт ЛКСМ правёў вайсковую гульню-манэўры, у якой удзельнічала каля тысячы комсамольцаў. Манэўры працягваліся тры дні. Мясцовасьць, дзе адбывалася гульня, папалася балоцістая. Комсамольцы несьлі разьведачную службу і ішлі ў наступленьне па пояс у вадзе. Ня глецзячы на гэта, ня было ніводнага дэзэртыра, ніводнага застаўшагася. На здымку—вячэра пасьля 20-ці верстнага пераходу ў саўхозе Страмутка, дзе знаходзіўся галоўны штаб кіраўніцтва.

Дыскусыйны аддзел

Як па твойму палепшыць адносіны комсамольцаў да сваіх бацькоў, малодшых братоў і сясьцёр?

„Хто суніме гэтага злодзея“—пыаецца бацька комсамольца Лэйзара

(Яч. ЦРК, г. Полацк)

Надаўна сустракае мяне бацька комсамольца Шэрмана Лэйзара (Шэрман Лэйзар калісьці быў піонэрам) і, цяжка ўздыхаючы,—кажа:

— Я ня ведаю, што мне рабіць?—Мой сын Лэйзар ня толькі нічога не дае ў хату на харчаваньне, **але прыходзіць да дому ды яшчэ і крычыць, нават і біцца пачынае.** Запытаеш у яго—чаму ты ні ў чым не дапамагаеш, чаму вады ня хочаш прынесьці, ты ж дома ясі?—А ён табе ў адказ:

— А **каму,—сваёй трухлявай старой маці?..**

— І куды мне ісьці, да каго зьвярнуцца, хто суніме гэтага злодзея, **ад зьверства якога захварэла маці,**—з больлю ў грудзёх скончыў бацька комсамольца.

Вось сапраўдны малюначак паводзін комсамольца ў сям'і. Вось «прыклад» для беспартыйнай моладзі, якая глядзіць за кожным шагам комсамольца.

Памятаю, яшчэ год таму назад бацька гэтага-ж самага Лэйзара апавядаў мне аб бесчалавечных дзеяньнях свайго сына. **Прамоў цэлы год, за ім і другі, а таковішча... тое самае, нават... палышылася.**

— Замест таго, каб паслухацца бацькоў і прынесьці вады, або зрабіць іншую работу,—Лэйзар кожны дзень тарчыць на баскэтбольнай пляцоўцы. Замест дапамогі бацькам грашмі, ён набывае для сябе розныя фізкультурныя „моды“. А прыходзіць дамоў—крычыць і б'ецца.

-- Дзе-ж ячэйка?---Што яна робіць?--Няўжо яна гэтага ня бачыць? — Няўжо аб гэтым ня ведаюць комсамольцы?

Яно можа і так, але... **у той-жа сям'і маецца і яшчэ адзін комсамолец—старэйшы брат Лэйзара.** Неяк ня верыцца, каб ён ня ведаў, як адносіцца да бацькоў яго малодшы брат.

-- Бязумоўна, ён усё гэта ведае, але маўчыць. Чаму?--пытаюся я ў яго. **Няўжо і цяпер не адкажа.**

Прыведзенае мною--**тыповы факт адсутнасьці нашай увагі да пытаньняў адносін комсамольцаў да сваіх бацькоў.**

Гэтаму трэба палажыць канец.

В. Г-чы



таварышамі «фундзіць». Ядуць яны марожанае, цукеркі, а часам і гарэлку п'юць. Праз дзень—у іх ня знойдзеш ні граша.

Калі такому комсамольцу кажаш, што гэтак рабіць дрэнна, дык ён у адказ: **„На мой век хопіць“.**

Былі выпадкі, калі комсамолец становіцца «добрым» і ўсё зробленае аддае бацькам. Але ці на доўга?—Праз дзень ён просіць у іх рубель, на другі—яшчэ два рублі і г. д. **Глядзіш, праз тыдзень ён ужо „вынянчыў“ у бацькоў усе свае грошы, ды яшчэ з „процантамі“.**

Віна тут падае галоўным чынам на бюро комсамольскай ячэйкі, якое нічога не зрабіла для таго, каб зьнішчыць такія выпадкі.

Шмат надзей па растлумачэньню гэтага пытаньня комсамольцы ўскладаюць на сход бацькоў, які будзе склікан «Чырвонай Зьменай».

Фрыдма Іл.

„Што мой сын—гроша ня варт“ —кажуць бацькі комсамольцаў

(Путчынская яч. ЛКСМБ, Койданаўскага раёну).

Комсамольцы нашай ячэйкі, якія жывуць у сям'і, нічога у яе новага, культурнага ня ўносяць.

Вось, напрыклад, комсамолец **Згурскі Ул.—папяровы** комсамолец, бо ён зусім не імкнецца да таго, каб перарабіць сваю сям'ю на новы лад. Бацькі ня любяць яго, бо рэлігійныя, і на гэтай глебе паміж імі часта бываць сваркі.

Наогул у нас вельмі часта чуеш ад бацькі альбо маткі таго ці іншага комсамольца такія словы:

— «**Што мой сын — гроша ня варт, як упісаўся ў комсамол, дык гультаём стаў; рабіць лянуецца, толькі тое і знае, што на сходы цягаецца**».

Гэта зусім справядліва, бо нічога карыснага бацькі ад свайго сына-комсамольца ня маюць. На словах комсамольцы ўсе робяць: і жывёлу даглядаюць, і насеньне да сяўбы чысьцяць, і, нават шматпольле заводзяць, — **але ўсё гэта толькі словы.**

У большасьці ўся сям'я глядзіць на комсамольца, як на якога-нёбудзь «камандзіра», якому толькі падавай, а ўзяць ад яго—нічога не магчыма.

Акса.

У мяне сёньня „шабас“

Бацькі комсамолкі Фурман—рэлігійныя. У духу паўнасьці рэлігіі яны выхавалі і сваю дачку.

Калі яна працавала ў сельсавеце,—бывала, скажаш ей:—«**Фурман, схадзі за вадою**». А яна, баючыся сваіх бацькоў, адказвае:—«**Не пайду,—у мяне «шабас»** (субота).

У пятніцу, як толькі бацькі Фурман запаляць «шабасныя» ліхтарыкі, яна ўжо перадаецца на сьвяточнаму і ніякай будзічнай работы выконваць ня будзе.

На частыя запытаньні комсамольцаў,—чаму яна так робіць, Фурман адказвала:—«**Не магу я пайсьці супроць сваіх бацькоў**».

— Ці правідлова так рабіць?

— Не, неправідлова.

Комсамолец не павінен лаяцца з бацькамі, вядучы антырэлігійную прапаганду такімі мэтадамі, як: «далоў багоў» і г.д. Ад гэтага мы ўжо даўно адмовіліся.

Але, таксама, нельга паддавацца рэлігійнаму ўплыву сваіх бацькоў, чым хварэе тав. Фурман. Ня б'ючы на рэлігійныя пачуцьці бацькоў, нам неабходна паступова ўводзіць новы быт у сваю сям'ю. Пачынаць трэба хоць бы з таго, каб сам комсамолец не выконваў рэлігійных звычаяў.

Зак.

А ў нас па „мастацкаму“.

(Ячэйка ЛКСМБ Працмастацтва, Менск).

Сярод комсамольцаў нашай ячэйкі няма ніякага парадку ў разьмеркаваньні свайго заробку.

Возьмем прыклады:

— Атрымоўвае комсамолец грошы, але ён іх ня бачыць. Чаму?—А таму, што бухгальтэр **увесь яго заробак пераводзіць на лік буфэту тэатру, дзе комсамолец за месяц ужо пасьпеў яго „праесьці“.**

Далей. Тыя, якія што-небудзь атрымалі, замест дапамогі бацькам, ідуць з

„Я выконваю абавязкі“,—

адказваюць комсамольцы бацькам і... ідуць гуляць.

Пытаньне «Якім павінен быць комсамолец дома»—самае балючае ў нашым жыцьці.

Я ў сваім артыкуле застанаўлюся толькі на ўзаемаадносінах комсамольцаў з бацькамі ў раёнах.

Шмат комсамольцаў да сваіх бацькоў адносяцца вельмі няўважліва:

— Калі трэба што небудзь зрабіць, яны любяць аднеквацца тым, што—**„мне няма часу, трэба выконваць комсамольскія абавязкі“. Але часта гэта замяняецца гуляньнем і лодарніцтвам.**

Кепскія адносіны бываюць паміж комсамольцамі і піонэрамі.

— Калі яны жывуць у аднэй сям'і, комсамольцы любяць эксплёатаваць піонэра—«Ты зрабі гэта, бо ты піонэр і павінен слухаць мяне—комсамольца» і г. д.

Часамі яшчэ бывае і так, што піонэр не зьяўляецца на занняткі атраду па віне брата ці сястры:—**комсамолец ідзе гуляць, а піонэра застаўляе сядзець дома.** Гэта зусім дрэнна.

А. З.

Савецкая ячэйка

ў барацьбе за рацыяналізацыю ўстановы.

Ці правільна гэта?

(Яч. ЛКСМБ ЦСУ, Менск)

На апошнім агульным сходзе комсамольскай ячэйкі ЦСУ быў пастаўлен даклад аб становішчы ўстановы ў сувязі з рацыяналізацыяй апарату. Даклад быў своечасовы, бо усю масу комсамольцаў гэтае пытаньне надта цікавіць. Ячэйка ўсяго некалькі месяцаў як існуе, аб становішчы апарату мала асьведомлена і на гэтаму пастановы РСІ аб ачыстцы апарату ад «фракцыі родзічаў», ад бесгаспадаранасьці і інш. надта цікавілі ўсю ячэйку.

Дакладчык, праўда, больш-менш падрабязна азнаёміў усіх комсамольцаў аб становішчы нашай установы, але, калі мы жадалі разгарнуць спрэчкі, каб добра высьвятліць гэтае пытаньне, на падставе чаго вынесьці конкрэтную рэзолюцыю з практычнымі мерапрыемствамі, дакладчык заявіў, што: «**ніякіх спрэчак рабіць не патрэбна, рэзолюцый таксама, бо папершае,--дарэмная трата часу, а падругое, хоць і вынясеце рэзолюцыю, то зрабіць вы нічога ня зможаце. Гэта справа адміністрацыі**».

Паміж тым, у пастанове 5-й усесаюзнай конфэрэнцыі ЎсеЛКСМ па пытаньню аб ўдзеле ЎсеЛКСМ у барацьбе з бюрократызмам у дзяржустановах, ясна гаварыцца: «З прычыны таго, што ў асобных выпадках парт'ячэйкі савецкіх установаў выносілі няправільныя вымовы ячэйкам УсеЛКСМ за рэзкую пастаноўку пытаньня, конфэрэнцыя просіць ЦК і ЦКК УсеКП растлумачыць партыйным ячэйкам савецкіх устаноў неабходнасьць энэргічнага ўцягненьня ячэек УсеЛКСМ у барацьбу з бюрократызмам і тактычнага кіраўніцтва імі».

Дакладчык-партыец ня толькі дапамог ячэйцы ў гэтай справе, але яшчэ запужаў: **„Вы нічога ня можаце зрабіць, рэзолюцыі вашы ні да чаго не давядуць“.**

Мы спадзяемся, што парт'ячэйка дасьць належнае кіраўніцтва ячэйцы КСМ у працы па барацьбе з бюрократызмам, рацыяналізацыі ўстановы і г. д., бо гэта адна з галоўных задач усіх савецкіх ячэек.

Свой.

Комсамолец за прылаўкам

(Менск, МЦРК)

50 комсамольцаў, працуючых у МЦРК, актыўна ўдзельнічаюць у жыцьці свайго коопэратыву. Яны акуратна наведваюць усе крамныя, цэхавыя, агульныя і вытворчыя нарады коопэратыву, і ня толькі наведваюць...

Комсамольцам-бухгальтарам МЦРК было высунута пытаньне аб спрашчэньні справаздачнасьці, дзякуючы чаму былі **скарочаны два рахункаводы.**

У крамах МЦРК ня было патрэбнага разьмеру ўпаковачнай бумагі для кожнага прадмету. Тавар, які каштуе некалькі капеек, упакоўвалі ў паперу, раўную каштоўнасьці гэтага тавару. Комсамольцы 21-ай крамы далі прапанову **аб загатоўцы кавалкаў паперы розных разьмераў.** Па адной толькі краме гэта дае экономію на **10 рублёў у месяц.** Прыкладу крамы № 21 **пасьледвалі** ўсе прадпрыемствы МЦРК.

У мэтах зьнішчэньня чаргоў у коопэратыве, экономкамісія ячэйкі высунула пытаньне аб **навешваньні тавараў да прыходу спажыўца.** Цяпер на прыходзіцца, як раней, стаяць гадзінамі ў вялікай чарзе.

Ня было раней асобнага складу скураных тавараў—яны знаходзіліся у краме № 18. Працаўнікі апошняй, карыстаючыся гэтым, **зьбіралі ў сваю краму самыя лепшыя тавары,** а астатнім крамам даставалася ўсё дрэннае. Комсамольцы далі **прапанову аб організацыі асобнага складу.** У выніку—палепшылася сыстэма прыёму тавараў і паменшыўся брак скуры.

Дзеля лепшага снабжэньня спажыўцоў, асабліва сялян мануфактурай **комсамолец Дубэрштэйн** высунуў пытаньне аб адчыненьні сеткі ларкоў мануфактуры па рынку. Два новых ларкі ўжо адчынены, гэтымі днямі адчыняюцца яшчэ два.

Многа прапаноў далі комсамольцы аб памяншэньні накладных выдаткаў і інш., садзейнічаючы тым самым зьніжэньню цэн у МЦРК.

Міхась З...



М. Ш. В. ставіць „рэкорд“!

(Менская школа вучнёўства М. Б. Б. Ш. Д.)

Здаецца, што такога рэкорду па пасыўнай падпісцы на «Чырвоную Зьмену», як М. Ш. В., ніхто ня паставіў. На 300 вучняў, якія знаходзяцца ў колектыве, ня выпісваецца аніводнай «Зьмены».

Такі рэкорд тлумачыцца тым, што комсамольская ячэйка да гэтага часу не наладзіла працу ўпаўнаважаных па друку. Што ні месяц, дык бюро зьмяняе ўпаўнаважанага, і вядома, што такая «ўпаўнаважацкая чэхарда» падпіскі ніколі не падыме.

Да гэтага трэба дадаць, што бюро на пасаду ўпаўнаважанага заўсёды вылучае самых пасыўных і непрацаздольных комсамольцаў. Быў калісьці добры ўпаўнаважаны, тады і падпіска была на належнай вышыні, але бюро пастаралася перавесьці яго на другую працу: і вось, як вынік усяго ноль экзэмпляраў («г. з. на ўвесь колектыў»).

Бюро ячэйкі лічыць, што такі лік «Чырвонай Зьмены» для ячэйкі зусім дастатковы.

Нін Акцябрскі.

„У „Чырвонай Зьмене“ няма нічога“

(Менск, яч. Лямавай фабрыкі)

9-га ліпеня на нашым комсамольскім сходзе быў заслуханы даклад аб «Чырвонай Зьмене».

Да гэтага часу падпіска на «Зьмену» была вельмі слабая. Калі я запытаўся ў сакратара ячэйкі, колькі выпісваецца «Чырвонай Зьмены», дык ён няўпэўнена адказаў: «Здаецца, два экзэмпляры, а можа і менш». Гэта на 38 чалавек! Упаўнаважаны па друку абсолютна не працуе. Не вядзецца ніякі вучот выпіскі газэт.

З ўсяго гэтага вось што атрымоўваецца—комсамольцы дачуліся, што ў «Чырвонай Зьмене» нешта напісана пра працу іхняга вайсковага гуртку. Бегаў, бегаў кіраўнік вайсковага гуртку і газэты гэтай не знайшоў.

Калі трэ' было распачынаць падрыхтоўчую працу да летняй політ-вучобы, дык **АПА** ячэйкі папёрся ў райком комсамолу за праграмай, тут яму сказалі, што вельмі добрая праграма зьмешчана ў „Чырвонай Зьмене“. Ён пабег да газэтчыкаў, але там не знайшоў.

Да гэтага выпадку АПА нашай ячэйкі лічыў, што ў „Чырвонай Зьмене“ нічога няма.

Пасьля дакладу аднагалосна было ўхвалена ўсім актывістым абавязкова выпісаць «Зьмену» на 6 месяцаў адразу, а ўпаўнаважанаму даць наганяй, каб у далейшым ён павёў больш энэргічную працу сярод комсамольцаў і беспартыйнай моладзі фабрыкі па падпісцы на „Чырвоную Зьмену“.

І. Г.

Выпісалі на 6 месяцаў

(Менск, яч. харчаўнікоў).

Даклад аб «Чырвонай Зьмене» прыцягнуў да выпіскі газэты ўсю нашу ячэйку.

Актыў наш, які да гэтаго часу **зусім ня выпісваў «Чырвоную Зьмену», зараз выпісаў на 6 мес.**

Астатнія камсамольцы таксама выпісалі газэту на іншыя срокі.

Фрыдмо.

Ад слоў да справы...

Рагачоўская раённая конфэрэнцыя ЛКСМБ, якая нядаўна адбылася, у абвестку дню ўключыла пытаньне аб пяцітыднёвіку «Чырвонай Зьмены». Была вынесена рэзолюцыя, у якой конфэрэнцыя прапанавала Райкому ЛКСМБ прыняць рашучыя меры для пашырэньня падпіскі на «Чырвоную Зьмену».

Гэта былі словы... Райком прыступіў да справы. Вынесена постанова у якой прапануецца усім сябрам бюро ячэек і актывістым, працуючым у раёным маштабе, выпісаць «Чырвоную Зьмену».

На ўсіх ячэйках Рагачоўскага раёну ставіцца пытаньне аб пяцітыднёвіку «Чырвонай Зьмены», пасьля чаго праводзіцца масавая падпіска на газэту.

У сувязі з пяцітыднёвікам організуецца суд над «Чырвонай Зьменай», сходы чытачоў і корэспондэнтаў газэты, нарады ўпаўнаважаных па друку і інш.

Т-э.



„Дыктатар“ у сям'і.

С.-гасп. падатак 1927-28 г.

З 20 мая па ўсёй Беларусі пачалася кампанія па вучоту об'ектаў абкладаньня, якая закончыцца к 20 ліпеня.

Дзякуючы кепскай падрыхтоўцы райвыканкомаў і сельсаветаў—у некаторых мясцох кампанія праходзіць ня зусім пасьпешна: кепска, а ў некаторых мясцох зусім ня праводзяцца сходы бедната па растлумачваньню пытаньняў, дзякуючы чаму ў камісіі па правядзеньню вучоту об'ектаў пападаюць нават кулацкія элемэнты. Па некаторых сельсаветах маецца недавучот маемасьці ападаткаваньня.

Саўнарком БССР даў распараджэньне Акрвыканкомам аб узмацненьні тэмпу працы па вучоту об'ектаў абкладаньня, прыцягваючы да суровай адказнасьці грамадзян, захоўваючых сваю маемасьць, прымаючы меры к бязьдзейным сельсаветам.

З 20 ліпеня на мясцох пачынаецца праца па вылічэньню падатку. Не пазьней 25 жніўня сялянам павінны быць уручаны акладныя лісты.

У першы дзень тыдню абароны.

Яшчэ рана. А ўжо шум пропэлераў зьвініць над горадам. Сёньня Менск пачынае праводзіць тыдзень абароны. Сёньня першы дзень гэтага тыдню.

Па вуліцах зьбіраюцца дэмонстранты.

З чырвонымі крыжамі на руках ідуць курсы санітарак Мен. ТСААвіяхіму. Ідуць стройна, як сапраўдныя чырвонаармейцы.

За імі курсанты інструктарскіх курсаў пры Доме Чырвонай Арміі. У кожнага з іх з боку процівагаз і паходныя сумкі.

А тады шэраг калён. Ідуць яны адбіваючы такт па вуліцах гораду. Вось стары рабочы з комсамолкай зьбіраюць грошы ў фонд «Наш адказ Чэмбэрлену». Яны падыходзяць да публікі, кажучы:—Таварыш, афяруйце на пабудову самалёту.

Той дастае з кішэні дробныя грошы і апускае іх у скрынку. Грошы падаюць у скрынку. Па радасных тварах зборшчыкаў відаць, што яны сёньня сабралі нямала грошай.

А тады ўсе разам на аэродром. Там стаяць выцягнуўшыся ў адну шарэнгу нашы аэропляны. А з боку два невялічкіх польскіх аэропляны. Сягоньня пасьля сьледзтва іх адпусьцілі з Менску і яны пакружыўшыся над горадам, ляцяць у сваю Польшчу.

З аўтамабіля рэчы. Гавораць ад Акруговага Камітэту Партыі, ТСА і інш. організацый.

Гарача спаткалі дэмонстранты словы начальніка эскадрыліі, які запэўніў усіх, што кожную хвіліну іх аэропляны гатовы да палёту. Зараз-жа ўзьвіліся ў неба сталевыя птушкі, ляцелі над галовамі людзей, рабілі мёртвыя петлі.

Сёньня над горадам адбыліся палёты сяброў ТСА. Пасьля заўтра будзе праведзена інсцэніроўка бою ў Менску.

Тыдзень абароны пачаўся.

Чычэ.

У МенакрТСААвіяхэму.

450 руб. ад кружачнага збору.

Ад кружачнага збору па Менску сабрана ў карысьць ТСААвіяхэму за дзень 10 ліпеня 450 руб.

Хэматрады за працай.

З 10 ліпеня пачалі працаваць організаваны АкрТСААвіяхэмам 3 хэматрады ў Менску.

У маладых будаўнікоў.

Нарада працаўнікоў сярод моладзі.

Нядаўна адбылася ўсебеларуская нарада працаўнікоў сярод моладзі профсаюзу будаўнікоў.

На нарадзе стаялі пытаньні: 1) Вынікі ўсесаюзнай нарады; 2) Даклады з месц прадстаўнікоў моладзі ў Гомельскі і Менскі акраддзяленьні саюзу будаўнікоў.

Вынесена пастанова аб перахсдзе моладзі на зьдзелачную працу.

Было адзначана, што палепшылася культурна-масавае абслугоўваньне рабочай моладзі саюзу будаўнікоў. Саюз дабіўся таго, што прадстаўнікі ў Акраддзяленьні звольнены ад працы на вытворчасьці на 6 дзён у месяц.

Нарада дала дырэктыву аб замацаваньні прадстаўнікоў моладзі на саюзнай працы, часта іх не зьмяняючы.

Да гэтага часу заўважваюцца звышурочныя працы падлеткаў на будаўнічых работах. Нарада сказала сваё слова аб узмацненьні аховы працы сярод моладзі, аб неабходнасьці ўзгодненьня гэтай працы з ворганамі Наркамату Працы.

Ліквідуем беспрацоўе.

Сярод кваліфікаванай моладзі саюзу будаўнікоў ня маецца ніводнага беспрацоўнага. Па ўсёй Беларусі налічваецца каля 200 чал. беспрацоўных некваліфікаваных маладых будаўнікоў.

На сэзонных будаўнічых работах зараз занята 500 чал., альбо 30 проц. усей моладзі саюзу будаўнікоў.

Акруговым аддзяленьням дадзена дырэктыва аб захаваньні вызначнага процанту для моладзі пры пасылцы на будаўнічыя работы.

Брыгаднае вучнёўства

У мінулым годзе па саюзу было 8 брыгад вучнёўства з колькасьцю 149 чал. (22 проц. усяго вучнёўства) зараз-жа 16 брыгад з 286 вучнямі ў іх.

Індывідыяльнае навучаньне праходзяць 265 падлеткаў.

Выпуск прафшкол

У гэтым годзе адбыўся выпуск у Менскай, Віцебскай і Магілёўскай прафшколах будаўнікоў.

Менская школа выпусьціла 35 вучняў якія ўсе разьмешчаны на будаўнічых работах.

ЦП прапанавала акраддзяленьням пасылаць выпускнікоў прафшкольцаў на будаўнічыя работы ў першую чаргу.

Скончыўшыя атрымліваюць зарплату па 6-7 разраду.

Зарплата

Сярэдняя зарплата моладзі саюзу будаўнікоў па Беларусі складае 4-й разрад.

Для Менску гэта складае 37 р. 62 к. для Віцебску і Магілёву—34 р. 20 к., для Бабруйску і Барысаву- 33 р. 30 к. і для Воршы—32 р. 40 к.

48 піонэрпрацаўнікоў на працу

Пасьля курсаў.

9-га ліпеня, пасьля месячнай працы, зачыніліся Ўсебеларускія курсы піонэрпрацаўнікоў.

За час працы на курсах было заслухана каля 80 лекцый па пэдалёгіі, пэдагогіцы і розным пытаньням піонэрпрацы; курсы таксама знаёміліся з практычнай працай Менскіх піонэратрадаў.

Былі праведзены экскурсіі: ў Музей Рэволюцыі, Гістарычны Музэй і на Менскую мэліорацыйную станцыю.

З 48 курсантаў добра скончылі курсы 44 чал.

Зараз курсанты накіраваны на працу па сваім раёнам.

Рыхтуем коопэратараў.

Больш 40 бронь-падлеткаў працуюць у Менскім Цэнтральным Рабочым Коопэратыве. Бронь у МЦРК запоўнена звыш, чым на 100 проц.

Дзеля навучаньня працы кожны бронь падлетак прымацованы да старэйшага, па краме ці аддзяленьні, прыказчыка.

Раней з навучаньнем бронь-падлеткаў справа абстаяла зусім кепска! Прыказчыкі скардзіліся на непасьпяховасьць і недысцыплінаванасьць бронь-падлеткаў.

З мэтай выжыцьця гэтых ненармальнасьцяў комсамольская ячэйка МЦРК склікала нарады бронь-падлеткаў сумесна з старэйшымі прыказчыкамі і загадчыкамі крамаў. На некалькіх нарадах ставіліся індывідуальныя справаздачы аб працы асобных бронь-падлеткаў.

Нарады сваёй мэты дасягнулі: зараз няма ні воднай скаргі на „брапявікоў“.

Палова ўсіх падлеткаў займаецца ў школе канторскага вучнёўства, дзе яны атрымліваюць усе веды, патрэбныя для коопэратара. Астатнія хлапцы не займаюцца ў школе з прычыны таго, што срод кі адпушчаны на навучаньне толькі 50 проц. вучняў.

У Менску зноў цырк!

Глядача кормяць стар'ём.

Зноў цырк!

Яшчэ не пасьпела расьнесьціся па гораду чутка, як яе пацьвердзілі крыклівыя афішы:

- „Атракцыён—„Белая Дама“, Джыгіт—сын вольных стэпаў, вялікія клоўны-сатырыкі Якабіна і Віктар».

І нарэшце: „вялікі міжнародны чэмпіонат францускай барацьбы“.

Далей на афішы шэраг „вядомых“ імен. Студэнт тыфліскага ўнівэрсытэту Коля Кавер'яні, спорт-інструктар Кіеўскіх клюбаў—Айвазаў і „агульны любімец“ Менску—Вася Буравы. За імі чэмпіёвы Італіі, Расіі, Нямеччыны, Эўропы.

Абывацельскі Менск узбударажыўся... Гаварылі аб прыбыўшых барцох, аб будучай якасьці чэмпіёнату і... дарагіх цэнах на білеты. У агульным—чакалі вялікай і добрай цыркавой програмы.

* * *

Вечар. Першыя дні працы цырку. Прывабліваючыя ўвагу афішы зрабілі сваю справу—поўны аншлаг.

Вось празьвінеў трэці званок, зайграў оркэстр і на арэну з крыкам на спрытным кані выехаў джыгіт сын вольных стэпаў. Ён пакруціўся на арэне, прарабіў шэраг звычайных і простых джыгіцкіх нумароў і раскланьваючыся зьнік. Публіка была расчаравана. Раздаліся некалькі воплескаў і па радох пранесься нездавольны гул.

Далей ня лепш... На чарзе выступленьне вядомых Менску „халтурыстых“ Якабіва і Віктара. Яны паўтарылі свой леташні рэпэртуар, дабавілі да гэтага некалькі аплявух служачым цырку, некалькі выразаў наконт фініспэктара, ДПУ і трох гадох з ізоляцыяй. І кінуўшы пару слоў аб алімэнтах і ЗАГС'у пасьпяшылі рэтыравацца.

Негрыцянскія жакеі адраталі сябе толькі „маркай“—чорным тварам і добрымі гарнітурамі.

Сярод іншых выступленьняў былі добрымі толькі 2-3 (глядыятары і акрабаты пад купалам цырку).

Расчараваная публіка ўсе надзеі ўскладвала на францускую барацьбу але і тут памылілася...

Не пасьпелі яшчэ барцы схапіцца ў „рашучай схватцы“, як у публікі нехта верна вызначыў якасьць барцоў:

— Кепскія! Заморышы нейкія... Акрамя Буравога, ды Цітава, здаецца, і няма добрых.

Так яно і вышла.

На трэцяй хвіліне Цітаў „сьмяючыся“ палажыў інструктара кіеўскіх спортклюбаў, хутка скончыліся другія „няроўнасільныя схваткі“, дзе змагаліся „чэмпіён міру“ і „асілак Крыму“, эўропэйская „велічыня“ і „зорка Данбасу“.

Скончыліся, і публіка сумна разышлася правіддова разважаючы:

— Пакуль ня будзе добрай програмы і добрых, выдатных барцоў, у цырк ня пойдзем...

І з гэтым трэба згадзіцца. **М. Таў.**

Летнія прыгоды

Кажуць, што бяз грошай зараз шагу ня ступіш. Бязумоўна маняць. Можна, не выяжджаючы за горад і ня маючы ніводнай капейкі, вольна павесяліцца, як кажуць, на-шармака. Напрыклад.



Пакупацца ў Сьвіслачы ля гарбарных заводаў



Асьвяжыцца мінэральнаю вадзіцаю



Замілавацца прыгожым лясным краявідам



Паслухаць музыку

Адказы чытачам

Рагачову (1010). Пытаньне аб тым каб вучняў, якія скончаць Менскаю аб'яднаную профшколу ў 1929 годзе прымаць бяз іспытаў у тэхнічныя ВНУ, зараз яшчэ ня вырашана.

Кантаровічу (1011). У «Чырв. Зьмене» пісаліся, што пытаньне аб організацыі ў Менску курсаў рахункаводаў яшчэ вырашаецца. Можна будзе паступіць на гэтыя курсы з ведамі сямігодкі.

Л. К. (1012). Соцыяльны адбор у тэхнікумы з ліку вытрымаўшых іспыты і аслабанёных ад іспытаў, будзе бязумоўна зроблен.

Фрадкіну (1013) По паказаньню Наркамасьветы, у профшколы будуць прымацца толькі асобы з ведамі сямігодкі. Умовы прыёму, былі надрукаваны ў нашай газэце.

Я. К. (1014). Пры паступленьні профшколу можна карыстацца праграм 1926-27 нав. году.



Ваенморы адказваюць

Ваенморы з лінкору „Парыская Комуна“ правялі збор грошай у фонд «Наш адказ Чэмбэрлену“. 8 рот, спэцыяльныя курсы. старшыні, комполітсклад і Політаддзел САБРАЛІ 175 р. 81 к.

Піонэры зьбіраюць грошы

Койданаўскі атрад піонэраў № 3 імя Адамовіча пры саюзе саўгандльслужачых сабрал 1 руб. 20 кап. і выклікае пасьледваць яго прыкладу наступныя атрады: атрад імя Рыкава (№ 1), атрад імя Лепсе (№ 12), атрад імя Ашаровіча (№ 6) атрад Койданаўскага раёну пры камуне «Чырвоны Сьцяг» імя „Кнорына“ і Станькаўскую базу.

Іх усяго 26...

(Менск, Эльвод)

Іх усяго 26... Але яны ўсю бронь не запаўняюць. Большая частка вучняў—22 чал., займаюцца ў вучнёўскай брыгадзе, а 4—на індывідуальнай працы.

Усе хлопцы выключна працуюць на кваліфікаванай працы: сьлесары, электраманцёры, вадаправодчыкі.

Абучэньне вядзецца па праграме. Узаемаадносіны майстроў і вучняў добрыя, канфліктаў ня было.

У абучэньні вучняў майстры зацікаўлены, але гэтакае палепшылася-б, каб яны атрымоўвалі за гэта компэнсацыю. Завадзкі камітэт (на ініцыятыве вучняў) паднімаў пытаньне аб компэнсацыі, але адміністрацыя не згадзілася. Справа перадана ў цэнтральнае праўленьне саюзу мэталістых. Трэба спадзявацца, што саюз будзе на баку заўкому.

Большая частка вучняў атрымлівае па 2 і 3 разраду, а самае большае—па пятаму.

Хлопцы хацелі організаваць тэхнічны гурток, але дырэктар адмовіўся даць на кіраўніка грошы і гэтая справа правалілася. Цяга сярод хлапцоў да набыцьця тэорэтычных ведаў надта вялікая і яны займаюцца самаадукацыяй, бяручы ў клюбнай бібліотэцы розныя кнігі.

Усе вучні, за выключэньнем 3-х чалавек, вучацца здавальняюча—цікавяцца сваёй працай, добра адносяцца да інструмантаў.

Да дрэнных бакоў трэба аднесьці тое, што вучні амаль нічога ня ведаюць аб рацыяналізацыі вытворчасьці. Вінавата ў гэтым комсамольская ячэйка.

Вытворчыя нарады наведваюцца толькі адным прадстаўніком ад вучняў, астатнія ня лічаць гэтага сваім абавязкам.

Ёсьць і прагульшчыкі, але мала. Супроць іх ячэйка вядзе барацьбу.

Дрэнна, што да гэтага часу ня было ні аднаго вечару спайкі паміж майстрамі і вучнямі.

— Пераліčаныя недахопы ячэйцы ў хуткім часе трэба зьнішчыць.

Як. Шур.

Часы Каліноўскага на экране

Крыху гісторыі

Кастусь Каліноўскі—выдатная фігура паўстанцкага руху на Беларусі XIX стагодзьдзя.

Кастусь Каліноўскі організуе паўстаньне за незалежнасьць Беларусі, за яе свабоду.

Гараць панскія маёнткі. Ляціць да гары дым зьмятаючы сьляды панскага прыгону.

Але ня толькі сярод сялян вядзе Кастусь Каліноўскі сваю працу.

Ён усюды...

І сярод рабочых Вільні, Менску і сярод салдат вядзе ён агітацыю—друкуе адозвы з заклікам да барацьбы.

Кастусь Каліноўскі сьмелы.

Ён з-пад носу вядомага гэнэрала Мураўёва выцягвае важныя сакрэтныя дакуманты

У нас у Менску (па Магазіннай вул.) у час аблавы на патаемную друкарню ён уцякае з рук паліцэйскіх.

Мураўёў аддае загад злавіць Кастуся.

Аблава... Загрыміраваны Каліноўскі яшчэ раз сабіраецца ўцячы.

Але ня ўдаецца. Злавілі.

А на заўтра ноччу ў Вільні на высокай гары павесілі Кастуся.

Стаяўшы на шыбеніцы ён казаў сваю апошнюю прамову.

І змоўк, калі на шыю адзелі вяроўку і стары палач выбіў з пад ног скамейку.

Кастусь Каліноўскі загінуў.

Яго справу прадоўжылі рабочыя і сяляне.

Зараз на Беларусі будуецца новае жыцьцё.

Вось прыблізна ў такім парадку мысьліць сцэнарыст даць у карціне нарыс жыцьця і барацьбы Кастуся Каліноўскага.

Маленькая абвестка і вялікі вынік

У пачатку ліпеня ў „Звезде“ зьявілась маленькая абвестка. У абвестцы пісалі аб здымцы кіно-стужкі „Кастусь Каліноўскі“. Пісалі аб тым, што патрабуюцца для здымкі статыстыя ў узросьце ад 25 да 60 гадоў, пісалі аб тым, што для таго, каб прымаць удзел у здымцы трэба мець бараду і вусы для мужчын і доўгія спадніцы жанчынам, і яшчэ пісалась, што праца статыстых будзе аплачана.

І маленькая абвестка дала вялікі вынік.

Да вызначанага часу к тэатру „Культура“ сабраліся ня толькі дзядзькі і цёткі ад 25 да 60 гадоў з доўгімі барадамі і спадніцамі, сабраліся і Менскія „піжоны“, якія лічылі сябе вялікімі артыстымі, намазаныя барышні, сябры мясцовых драмгурткоў і нават 12-ці гадовыя піонэры. Усе жадалі быць зьнятымі, кожнаму хацелася з часам убачыць свой твар на экране.

А ў маленькім пакоі рэжысэр **Гардзін** і дырэктар Беддзяржтэатру Дыла спакойна адбіралі для стужкі ўдзельнікаў.

Вось уваходзіць малады студэнт. Рэжысэр пытліва абглядвае ўвайшоўшага.

— Скажэце, калі ласка,—пытаецца ён у студэнта,—ці будзе ў Вас заўтра барада?

— Барада?—баязліва пытаецца у адказ студэнт.—Не ня...

— Ідзеце! Ня годны. У абвестцы ясна сказана...

На чарзе беспрацоўная жанчына.

— Вось гэта тыпаж!—ускліквае рэжысэр.—Прымаем Вас, цетка, на два тыдні. 2 рублі ў дзень... Хочаце?

Але тут разгортваецца гандаль. Жанчыне гэта мала і рэжысэр набівае цану.

— Тры рублі...

— Мала...

— Чатыры...

— Добра.

„Тыпажам“ рэжысэр даражыць і яго ад сябе ня выпусьціць пакуль ня даб'ецца ўдзелу „тыпа“ у здымцы.

А за дзьвярыма хвалюецца натоўп. Шмат якія жадаюць удзельнічаць у здымцы і толькі некаторыя будуць „шчасьліўцамі“.

Заўтра здымка!

Здымаюць.

5 гадзін раніцы. На вуліцах пуста, толькі міліцыянэры ахоўваюць парадак.

Па вуліцах ужо ідуць „артыстыя“. Яны павінны атрымаць касьцюмы, загрыміравацца і ісьці на Траецкую гару.

Там ужо рэжысэр, апэратар, і яго памочнікі.

Сёньня павінны адбыцца здымкі рынку ў Вільні.

Памочнік рэжысэра расстаўляе вазы, расаджвае цыган.

Здаецца ўсё гатова. Акторы на месцы.

Але здымаць ня можна.

Сонца, насьміхаецца над рэжысэрам. Яно вылзе на хвіліну і зноў схаваецца.

Нарэшце. Сонца ёсьць. Рэжысэр крычыць у рупар:

„Прыгатуйцеся. Здымаю. Некалькі рэпетыцый і сцэна ў якой сяляне слухаюць Каліноўскага і пасьля закідваюць агуркамі жандараў—зьнята.

Вышла ўдала. Здымаюць другую сцэну.

* * *

Экспэдыцыя пасьля працы ў Менску выехала ў вёску, для здымкаў сцэны пажару, пасьля чаго зноў вернецца ў Менск, дзе на Пляцу Волі будзе зьнята сцэна кары Кастуся Каліноўскага.

Фільма здымаецца.

Эд. і Мік.

Паштовая скрынка

Рэзнікаву. У тваім допісу ўзята многа пытаньняў, але ні адно добра ня высьветлена.

Клопаву. Допіс ня пойдзе. Трэба пісаць, што робіцца ў галіне рацыяналізацыі, а не што гаворыцца.

М. Я. Р. (Прапойск) Агульна напісана, адным словам „многа дасягненьняў“, а дзе-ж факты?

Рагінскаму. Пішы падрабязгова як вы працуеце з насьценгазэтай?

Дрозду. (в. Явангелевічы) Адаслана ў „Беларускі Піонэр“.

Вярнікоўскаму. Аб рабоце курсаў актыву ты напісаў агульна. Трэба было застанавіцца на адным якім небудзь цікавым конкрэтным пытаньні.

Згублены.

○ Сяброўскі білет № 9992, выдадзены Бабруйскім АК ЛКСМБ на імя **Прорвіча А. І.**

○ Сяброўскі білет № 5452, выдадзены Менскім АК ЛКСМБ на імя **Шура Т. М.**

Лічыць страціўшымі моц.

Адказныя рэдактары { А. БАРАНЬНІКАЎ. А. КУРЦІК.

Галоўлітбел № 24867 Менск, 2 друкарня БДВ.